дзенскага ГЖУ М. І. Шамшова, што Я. Ю. Тамасяк быў арыштаваны і дастаўлены ў г. Люблін у суправаджэнні вахмістра Т. Влязлова і унтэрафіцэра Л. Болбата [4, арк. 112].

Такім чынам, ва ўмовах ускладнення грамадска-палітычнай сітуацыі ў Расійскай імперыі напярэдадні Першай сусветнай вайны органамі палітычнага вышуку Дэпартамента паліцыі МУС прымяняліся прэвентыўныя меры, накіраваныя на нейтралізацыю любых форм антыўрадавай дзейнасці ў беларускіх губернях. Асаблівая ўвага надавалася актыўнасці палітычных партый і аб’яднанняў. Узаемадзеянне Люблінскага ГЖУ і Гродзенскага ГЖУ па пытаннях вышуку і арышту былога баевіка ППС-ФР Я. Ю. Тамасяка ў 1913 г. з’яўляецца прыкладам прадухілення патэнцыйнай небяспекі з боку радыкальных элементаў у рэгіёне.

## Бібліяграфічны спіс

1. Адрес-календарь и справочная книжка Гродненской губернии на 1914 год / Гродн. губерн. стат. ком. Гродна : Губерн. тип., 1913.

2. *Бусько, С. І.* Асобны Корпус Жандараў і сістэма нагляду за палітычнымі партыямі ў беларускіх губернях у 1907–1914 гг. // «Долгий XIX век» в истории Беларуси и Восточной Европы: исследования по Новой и Новейшей истории: сб. науч. тр. Вып. 2 / редкол.: И. А. Марзалюк (пред.) [и др.]. Минск: РИВШ, 2018. С. 60–63.

3. *Бусько, С. И.* Структура и кадровый состав губернских жандармских управлений на территории Беларуси (конец XIX – начало XX в.) // Працы гістарычнага факультэта БДУ : навук. зб. Вып. 5 / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. Мінск : БДУ, 2010. С. 9–18.

4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (далей – НГАБ у г. Гродна). Ф. 366. Воп. 1. Спр. 439.

5. «Охранка»: Воспоминания руководителей политического сыска / Вступ. статья, подгот. текста и коммент. З. И. Перегудовой. Т. 1. М. : Новое литературное обозрение, 2004.

6. *Перегудова, З. И.* Политический сыск России (1880–1917) / З. И. Перегудова. 2-е изд., перераб. и доп. М. : РОССПЭН, 2013.

7. *Tomicki, J.* Polska Partia Socjalistyczna, 1892–1948. Warszawa : Książka i Wiedza, 1983.

УДК 338.245.2(476)"1812"

# СУКОННАЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ НАПЯРЭДАДНІ ВАЙНЫ 1812 г. І СПРОБЫ ЯЕ МАБІЛІЗАЦЫІ РАСІЙСКІМІ ЎЛАДАМІ

**А. М. Лукашэвіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, lukashevand@mail.ru*

У артыкуле аналізуецца стан суконнай прамысловасці беларускіх губерняў напярэдадні вайны 1812 г. і спроба расійскіх улад мабілізаваць яе магчымасці для патрэб расійскай арміі. Паказана, што з-за адсутнасці на тэрыторыі Беларусі прадпрыемстваў па вытворчасці зброі і боепрыпасаў урад сканцэнтраваў асноўную ўвагу на пашырэнні суконнай вытворчасці. Раскрываецца механізм стварэння на ільготных умовах мануфактур, якія павінны былі пастаўляць сукно для патрэб расійскага войска. Адзначаецца, што

прапанаваныя ўмовы для арганізацыі суконнай вытворчасці з'яўляліся эканамічна не выгаднымі, паколькі ўладальнікі прадпрыемстваў павінны былі да пагашэння пазыкі пастаўляць сваю прадукцыю ў казну па фіксаванай цане. Робіцца выснова, што ўраду не ўдалося істотна павялічыць пастаўку сукна з беларускіх губерняў, паколькі насельніцтва па эканамічных і палітычных матывах ўхілялася ад стварэння новых прадпрыемстваў або сабатавала вытворчасць сукна на існуючых мануфактурах.

***Ключавыя словы:*** суконная прамысловасць; мабілізацыя; беларускія губерні; Расійская імперыя; мануфактура; абмундзіраванне; сабатаж.

# СУКОННАЯ ПРОМЫШЛЕННОСТЬ БЕЛОРУССКИХ ГУБЕРНИЙ ПЕРЕД ВОЙНОЙ 1812 г. И ПОПЫТКИ ЕЕ МОБИЛИЗАЦИИ РОССИЙСКОЙ ВЛАСТЬЮ

**А. М. Лукашевич**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, lukashevand@mail.ru*

В статье анализируется состояние суконной промышленности белорусских губерний накануне войны 1812 г. и попытка российских властей мобилизовать ее возможности для нужд российской армии. Показано, что из-за отсутствия на территории Беларуси предприятий по производству оружия и боеприпасов правительство сконцентрировало основное внимание на расширении суконного производства. Раскрывается механизм создания на льготных условиях мануфактур, которые должны были поставлять сукно для нужд российской армии. Отмечается, что предложенные условия для организации суконного производства оказались экономически не выгодными, поскольку владельцы предприятий должны были до погашения ссуды поставлять свою продукцию в казну по фиксированной цене. Делается вывод, что правительству не удалось существенно увеличить поставку сукна из белорусских губерний, поскольку население по экономическим и политическим мотивам уклонялось от заведения новых предприятий или саботировало производство сукна на имевшихся мануфактурах.

***Ключевые слова:*** суконная промышленность; мобилизация; белорусские губернии; Российская империя; мануфактура; обмундирование; саботаж.

# THE CLOTH INDUSTRY OF THE BELARUSIAN PROVINCES BEFORE THE WAR OF 1812 AND ATTEMPTS TO MOBILIZE IT BY THE RUSSIAN GOVERNMENT

**A. M. Lukashevich**

*Belarusian State University, Independence Ave., 4, 220030, Minsk, lukashevand@mail.ru*

The article analyzes the state of the cloth industry of the Belarusian provinces on the eve of the war of 1812 and the attempt of the Russian authorities to mobilize its capabilities for the needs of the Russian army. It is shown that due to the absence of enterprises for the production of weapons and ammunition on the territory of Belarus, the government focused on expanding the cloth production. The article reveals the mechanism for creating on preferential terms manufactories that were supposed to supply cloth for the needs of the Russian army. It is noted

that the proposed conditions for organizing cloth production turned out to be economically unprofitable, since the owners of the enterprises had to supply their products to the treasury at a fixed price before repayment of the loan. It is concluded that the government failed to significantly increase the supply of cloth from the Belarusian provinces, since the population, for economic and political reasons, avoided establishing new enterprises or sabotaged the production of cloth at the existing factories.

***Keywords:*** cloth industry; mobilization; Belarusian provinces; Russian Empire; manufactory; uniforms; sabotage.

У гістарыяграфіі вайны 1812 г. адным з маладаследаваных пытанняў застаецца дзейнасць расійскага ўрада па мабілізацыі «цяжкай» і лёгкай прамысловасці заходніх губерняў для патрэб арміі ў пасля тыльзіцкі перыяд. Асобныя сюжэты гэтай праблемы закраналіся ў працах дарэвалюцыйных [11; 13], савецкіх [1; 5; 6] і сучасных расійскіх даследчыкаў [2]. Але яны не тычыліся заходніх губерняў.

Таму ў артыкуле аналізуецца пошук урадам розных сродкаў і метадаў для мабілізацыі прамысловасці (у першую чаргу суконнай) беларускіх губерняў для патрэб расійскай арміі напярэдадні вайны 1812 г. Для раскрыцця тэмы выкарыстоўваліся розныя дакументы Ваеннага міністэрства, міністэрстваў паліцыі і ўнутраных спраў, а таксама губернскай адміністрацыі, якія захаваліся ў архівах Беларусі і Літвы. Пераважна, гэта ўрадавая перапіска, якая тычылася збора звестак аб прадпрыемствах, на якіх можна вырабляць сукно, а таксама розныя распарадчыя дакументы. Яны раскрываюць механізм пашырэння сеткі мануфактур па вытворчасці сукна на тэрыторыі Беларусі за кошт выдачы ільготных пазык, а таксама рэальныя вынікі гэтай задумы.

**Стан прамысловасці ў пачатку XIX ст.** Прамысловасць пяці беларускіх губерняў (Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Гродзенскай і Віленскай) у пачатку XIX ст. была развіта адносна слаба. Асноўным відам вытворчасці ў гэты час з'яўлялася перапрацоўка прадуктаў сельскай гаспадаркі – вінакурэнне (да пачатку 1806 г. больш 94 % усіх прадпрыемстваў). З іншых галін прамысловасці найбольш развітой была лёгкая: у пяці беларускіх губернях дзейнічала 15 з 110 суконных і ваўняных фабрык Расійскай імперыі, што складала 13,6 %. Пры гэтым на тэрыторыі Беларусі адсутнічалі магчымасці па вытворчасці гармат і боепрыпасаў [7, с. 257–259; 9, арк. 117].

Да моманту далучэння Расійскай імперыі да кантынентальнай блакады Англіі ў 1807 г. шматлікія патрэбы ваеннага ведамства ў матэрыялах, якія выкарыстоўваліся для вытворчасці абмундзіравання, пакрываліся за кошт імпарту. З-за мяжы таксама паступалі салетра, порах і свінец, неабходныя для вырабу ўзбраення і боепрыпасаў.

У 1802–1806 гг. імпартныя пастаўкі шарсцяных, баваўняных, палатняных і шаўковых матэрыялаў і вырабаў ацэньваліся ў сярэднім у 9 355 тыс. руб. срэбрам у год. Пасля далучэння Расіі да кантынентальнай блакады ўвоз гатовых вырабаў значна скараціўся. Імпарт тых жа матэрыялаў і вырабаў у 1807–1812 гг. у сярэднім паменьшыўся да 2298 тыс. руб. срэбрам, г. зн. знізіўся на 7 057 тыс. руб. срэбрам (75,4 %) [5, с. 319].

Такім чынам, у гады кантынентальнай блакады ў Расійскай імперыі ўзнік востры недахоп сукна. Сітуацыя ўскладнялася тым, што больш за палову ўсёй вытворчасьці расійскай суконнай прамысловасці спажывала армія.

У гэтых умовах кіраўніцтва ваеннага ведамства прыняло шэраг мер, накіраваных на скарачэнне выдаткаў на выраб абмундзіравання. Са снежня 1807 г. пашыў мундзірнага адзення для ніжніх чыноў ажыццяўляўся ў вайсковых частках [13, с. 320–321; 12, т. 30, № 23205]. У 1808 г. з-за недахопу сукна ва ўсіх палках кавалерыі, пяхоты, артылерыі і ў гарнізонных частках тэрміны выкарыстання мундзіраў былі прадоўжаны на год. Адначасова ў інвалідныя роты і ваенна-сіротныя аддзяленні замест матэрыялаў сталі выдаць наяўныя грошы [13, с. 322; 11, с. 15]. Нягледзячы на гэта, да 1 лістапада 1809 г. камісарыяцкае ведамства не даатрымала 794 002 аршына суконных матэрыялаў, што складала амаль 35 % гадавой патрэбы. Каб задаволіць патрабаванні войскаў, было вырашана прыняць 212 577 аршын забракаванага сукна. Пры гэтым усе страты ад «неданоса рэчаў», выробленых з недабраякаснага матэрыялу, былі аднесены на рахунак дзяржаўнага казначэйства [13, с. 322; 4, т. 1, с. 396].

**Меры ўрада па павелічэнні вырабу салдацкага сукна.** З мэтай пошуку ўнутраных рэзерваў для павелічэння вытворчасці сукна у 1808–1810 гг. ўрад прыняў шэраг першачарговых мер. Быў істотна павялічаны імпарт воўны і бавоўны (у 1812 г. воўны было ўвезена ў 13 разоў больш, чым у 1802–1806 гг.) [5, с. 316], звернута ўвага на паляпшэнне авечкагадоўлі; урэгуляваны і палегчаны правілы для прыёму суконных вырабаў у казну; павялічаны цэны на салдацкае сукно і выпрацаваны парадак іх прызначэння [12, т. 30, № 23975; т. 31, № 24469]. Ваеннае міністэрства таксама прыняла пэўныя меры па павелічэнні вытворчасці сукна (дазвол на набыццё для войска сялянскага сукна для вырабу з яго салдацкіх шынялёў). Акрамя таго, для каардынацыі дзейнасці ўсіх прадпрыемстваў былі створаны спецыяльныя органы (Галоўнае праўленне мануфактур) [11, с. 11; 12, т. 30, № 23121; 13, с. 325].

У 1808 г. былі распрацаваны спецыяльныя правілы, якія выкладзены ў дакладах міністра ўнутраных спраў князя А. Б. Куракіна ад 26, 27 і 30 чэрвеня 1808 г. («Аб забеспячэнні арміі сукном», «Аб сродках да ахілення недахопу ў сукне, для абмундзіравання войскаў патрэбных…», «Аб стварэнні Галоўнага праўлення мануфактур») [12, т. 30, № 23121]. Згодна з

імі ўсім жадаючым арганізаваць суконную вытворчасць выдаваліся ўрадавыя субсідыі. У асноўным правілы тычыліся «польскіх» губерняў, у якіх назіралася найбольшае распаўсюджванне авечкагадоўлі і, такім чынам, мелася сыравіна для суконнай прамысловасці. У 1808 г. у «польскіх» губернях, па дадзеных міністра ўнутраных спраў князя А. Б. Куракіна, было 28 суконных прадпрыемстваў з агульнай колькасцю 98 станаў. Паколькі ў заходніх губернях мелася досыць воўны, «і ў многіх месцах яна [была] палепшана шлёнскай пародаю авечак», урад разлічваў праз «дапамогу прыватным асобам» павялічыць колькасць фабрык, якія ўжо існавалі, і забяспечыць іх работнікамі [8, арк. 141; 3, с. 227].

Князь А. Б. Куракін лічыў, што падобныя прадпрыемствы змогуць ствараць як заможныя яўрэі, так і памешчыкі. Па палажэнню 1804 г. аб яўрэях ўсім, хто «паступаў у званне фабрыкантаў», выдаваліся грашовыя пазыкі і розныя перавагі. Грашовая дапамога абяцалася і памешчыкам, якія з дапамогай яўрэяў створаць на сваіх землях суконныя фабрыкі. На думку міністра, дастаткова было «адпусціць капітал для гэтых пазык», а жадаючыя арганізаваць вытворчасць «як з памешчыкаў, так і з яўрэяў, безумоўна, знойдуцца» [8, арк. 141 зв.; 3, с. 227].

Умовы прадастаўлення пазык былі наступнымі. Для асоб, якія ўжо мелі ў «польскіх» губернях суконныя прадпрыемствы, пры жаданні пашырыць вытворчасць, выдавалася 300 руб. за кожны новы стан. Пры заснаванні новай суконнай «фабрыкі», належыла: для вырабу «суровы» – па 1 000 руб., а з поўным аздабленнем – па 3 000 руб. за кожны стан. Выдадзеная пазыка павінна была вяртацца «ў пакладзены па ўмовах час». Для гарантыі яе вяртання ў памешчыкаў прадпісвалася браць у заклад маёнткі, а ў яўрэяў – даручальніцтва ўсяго грамадства або кагалу.

Кожны, хто атрымліваў ад урада пазыку, быў абавязаны штогод пастаўляць сукно для арміі да поўнага яе пагашэння. Калі прадпрыемства працавала цэлы год, з кожнага стана вынікала пастаўляць па 800 аршын «зусім аздобленага сукна», або 1 200 аршын суровы. У выпадку сезоннай працы прадпрыемства, калі памешчыкі выкарыстоўвалі працу сялян толькі ўзімку, яны абавязаны ставіць 400 і 600 аршын адпаведна. Да поўнага вяртання пазыкі аплата за пастаўленае сукно ўсталёўвалася па фіксаваных цэнах, нароўні «з іншымі абавязанымі фабрыкантамі». Пасля выплаты пазыкі прадпрыемствы пераводзіліся на становішча «вольных фабрык», а іх уладальнікі абавязваліся пастаўляць сукно для войска ўжо на добраахвотных пачатках. Увогуле, лічыў міністр, у заходніх губернях будуць створаны ўмовы для росту існуючых суконных прадпрыемстваў і падставы да сварэння новых [8, арк. 141 зв. – 142; 3, с. 228]. Для працы на мануфактурах прапаноўвалася выкарыстаць дзве катэгорыі асоб: яўрэяў і чыншавую шляхту [8, арк. 141–141 зв.; 3, с. 227–228].

Такім чынам, урад спрабаваў за кошт аднаразовых субсідый павялічыць вытворчасць сукна і паставіць працу ўсіх новых і пашыраных прадпрыемстваў «польскіх» губерняў на патрэбы расійскай арміі. Прычым пастаўка сукна павінна была ажыццяўляцца па фіксаваных цэнах, што першапачаткова пазбаўляла прадпрымальнікаў часткі прыбытку і сродкаў на пашырэнне вытворчасці.

**Стварэнне новых прадпрыемстваў.** 17 ліпеня 1808 г. міністр унутраных спраў разаслаў грамадзянскім губернатарам цыркуляр, у якім прасіў «адразу прыступіць да выканання ... намераў ўрада». Адказнасць за паспяховасць гэтай справы ўскладалася персанальна на начальнікаў губерняў. 14 жніўня князь А. Б. Куракін разаслаў у губерні асобнікі зацверджанага дакладу (у выглядзе кніжак, для раздачы жадаючым) і прасіў аказваць дапамогу ў вярбоўцы асоб, якія жадалі пашырыць або пачаць сваю вытворчасць [8, арк. 159–160].

Існуючыя дакументы даюць магчымасць прасачыць спробу рэалізацыі гэтага праекта практычна ва ўсіх беларускіх губернях.

У Віцебскай губерні па прадстаўленні грамадзянскага губернатара П. І. Сумарокова камітэт па перасяленню яўрэяў 22 жніўня 1808 г. разгледзеў палажэнне аб добраахвотнай і прымусовай працы яўрэяў на новастораных фабрыках. З мэтай пашырэння суконнай вытворчасці і забеспячэння яе працоўнымі рукамі камітэт вырашыў апублікаваць ўмовы атрымання пазык, а таксама сабраць звесткі аб неабходнай колькасці работнікаў і ўмовах аплаты працы. Адначасова кагалам было «асабліва загадана» каб яны «ў найхутчэйшы час даставілі ў камітэт імянныя спісы абоіх полаў бедным яўрэям з паказаннем імёнаў іх і прозвішчаў, гадоў і актуальнага месца знаходжання». Падобная мера прымалася на выпадак, калі кагалы не зробяць «добраахвотнымі складкамі дапамог» для перасялення яўрэяў з вёсак (згодна з указам ад 19 кастрычніка 1807 г.). Тады камітэт меў намер прыняць усе патрэбныя меры да накіравання яўрэяў на фабрыкі, дзе яны ўласнай працай здольны будуць дастаўляць сабе і сямействам сваім пражытак [3, с. 229].

Гродзенскі грамадзянскі губернатар В. С. Ланской аб прынятых мерах «да ўзмацнення вырабу салдацкіх сукон» дакладваў ў Галоўнае праўленне мануфактур 30 кастрычніка 1808 г. Аднак пахваліцца поспехамі ён не мог: на яго зварот адгукнуліся толькі гаспадары Хомскай (В. Пуслоўскі) і Ружанскай (яўрэі Гецель Эпштэйн, Берка Берман, Гершон Закіма) фабрык. І далей В. С. Ланской быў яшчэ больш песімістычны: «І нават не прадбачу надзеі да магчымага множання вырабу сукон з-за адсутнасці тут прыватных людзей з вялікімі капіталамі і ад недахопу сродкаў, з якіх галоўны складаецца ў майстрах і матэрыялах» [3, с. 230]. Пры гэтым губернатар адзначаў,

што сярод памешчыкаў увогуле бессэнсоўна шукаць жадаючых пачаць вытворчасць, паколькі іх прыбытак заключаецца «у земляробстве і вінакурэнні і гандлі гэтымі лішкамі, па зручнасці замежжа» [3, с. 230]. Таму В. С. Ланской нават не стаў шукаць жадаючых.

Падобнай сітуацыя была і ў Мінскай губерні. Як паведамляў 21 лістапада 1808 г. грамадзянскі губернатар князь С. М. Хаванскі, «у Мінскай губерні ніхто па гэты час не аб'яўляе жадання на распаўсюд сапраўдных фабрык». У якасці прычыны адмовы ад арганізацыі вытворчасці паказвалася дарагоўля воўны, якая ўзнікае «ад нязручнай гадоўлі авечак» у губерні, усцяж пакрытай лясамі [3, с. 231].

Сітуацыя паўтарылася ў Віленскай губерні. Як паведамляў 8 лістапада 1808 г. грамадзянскі губернатар М. І. Брусілаў, нягледзячы на прынятыя меры, у яго губерні «жадаючых зусім не адгукнулася». Не дапамаглі і асабістыя перакананні губернатара: яго спробы схіліць памешчыкаў на стварэнне фабрык не мелі поспехаў. Найбольш пашыранай была адгаворка, што ў Віленскай губерні адсутнічае воўна. І толькі ўладальнік Трабскага староства (Ашмянскі павет) Рафаіл Паплаўскі пагадзіўся, у выпадку аказання фінансавай дапамогі, завесці 6 або 8 станаў «для дасканалага аздаблення сукна», аднак забяспечыць гэтую суму закладам ён не мог [3, с. 230].

Паколькі М. І. Брусілаў аказаўся бяссільны зрабіць што-небудзь для ўстановы суконнай фабрыкі ў Вільні, князь А. Б. Куракін звярнуўся 16 жніўня 1809 г. за дапамогай да літоўскага ваеннага губернатара [7, с. 228; 14, арк. 1–2 зв.]. М. І. Кутузаў параіўся з «начальнікам над заснаванай тут філянтрапічнай установай» манахам ордэна дамініканцаў Каржэнецкім – «чалавекам, які мае шмат звестак і пазнанняў, асабліва па частцы гаспадарчай». Як аказалася, гэта «чалавекалюбная ўстанова» гатова была ў 1810 г. «зладзіць у сябе суконную фабрыку на карысць ўрада», і ў непрацяглы час вырабіць «некаторую колькасць ладнага сукна». На думку М. І. Кутузава таварыству трэба было аказаць дапамогу ў памеры 3 тыс. руб. срэбрам [7, с. 228; 14, арк. 3–3 зв.].

Аднак ужо 19 верасня 1809 г. літоўскі ваенны губернатар расчараваў князя А. Б. Куракіна: спадзяванняў на арганізацыю фабрыкі не засталося. Члены таварыства правялі сход, на якім абмеркавалі магчымасць арганізацыі фабрыкі і адмовіліся ад гэтай ідэі з-за «непераадольных перашкод» (адсутнасці свабодных памяшканняў і наяўнасці працаздольных работнікаў) [7, с. 234; 14, арк. 6–7 зв.]. Таму М. І. Кутузаў звярнуў увагу на віленскіх яўрэяў. Ён спадзяваўся, што сярод іх адшукаецца пэўная колькасць бедных асоб, якія пажадалі б заняцца працамі ў суконнай фабрыцы. Літоўскі ваенны губернатар нават планаваў перагаварыць з яўрэйскімі старшынямі [7, с. 234]. Аднак у сувязі з працяглым адпачынкам, а затым ад'ездам М. І. Кутузава ў Малдаўскую армію, гэтая ініцыятыва засталася нерэалізаванай.

**«Нядобрасумленныя» прадпрымальнікі.** Паколькі жадаючых арганізаваць суконную вытворчасць з ліку вядомых прадпрымальнікаў не аказалася, губернскія ўлады хапаліся за любых памешчыкаў, купцоў і гандляроў, і раздавалі ім пазыкі. І як аказалася, сярод іх было шмат прайдзісветаў, якія вырашылі такім чынам пажывіцца за кошт казны.

Да ліку нядобрасумленных фабрыкантаў варта, напрыклад, аднесці памешчыкаў Магілёўскай губерні – былога камергера польскага двара Вікенція Янчэўскага, былога ротмістра польскіх войскаў Антона Янчэўскага, калежскага асэсара Скір'ята, а таксама яўрэйскіх купцоў Кроля і Лур'е. Усе яны не выканалі абавязацельстваў перад урадам.

Так, 28 лютага 1810 г. Вікенцій і Антон Янчэўскія, а таксама Скір'ят заключылі з урадам пагадненне на арганізацыю вытворчасці. Янчэўскія бралі пазыку на 15, а Скір'ят – на 7 станаў, і планавалі «мець іх у поўным дзеянні» [10, арк. 345]. У 1811 г. яны павінны былі паставіць адпаведную колькасць сукна і каразеі. Аднак Янчэўскія не паставілі больш за трацiну, а Скір'ят – да паловы ад нормы [10, арк. 319]. Да вясны 1812 г. яны ўтрох недапаставілі 17 600 аршын сукна [10, арк. 119 зв.–120].

Напярэдадні вайны з Францыяй расійскі ўрад быў занепакоены недапастаўкамі сукна і каразеі, паколькі новае фармаванне войскаў памнажала патрэбу ў мундзірных рэчах. Таму 27 красавіка 1812 г. міністр унутраных спраў В. П. Казадаўлеў запатрабаваў ад магілёўскага грамадзянскага губернатара графа Дз. А. Талстога, каб усе «гаспадары і ўладальнікі суконных фабрык, якія не выканалі сваіх абавязкаў, выставілі неадкладна належную з іх колькасць». Даўжнікам пагражалі, што «ўвесь недахоп, які можа апынуцца на іх да паловы гэтага года, абавязкова выкуплены будзе на іх рахунак, не прымаючы ніякіх адгаворак». Графу Дз. А. Талстому даручалася змусіць Янчэўскіх і Скір'ята да пастаўкі «недаімачнага сукна» [10, арк. 319–319 зв.].

Аднак колькі ўрад ні пагражаў, дамагчыся дадатковай пастаўкі сукна ад названых асоб ён не змог. Таму ўзнікла падазрэнне: а ці існуюць гэтыя фабрыкі ўвогуле, і што яны з сябе ўяўляюць? 4 мая 1812 г. міністр унутраных спраў прасіў губернатара даручыць «добранадзейнаму чыноўніку» агледзець іх «ва ўсіх частках» і даведацца: колькі ў рэчаіснасці ўстаноўлена станаў; «з якім поспехам адбываецца выраб сукна»; а таксама «ў якім парадку знаходзіцца наогул фабрычная вытворчасць» [10, арк. 345 зв.]. Аднак выправіць сітуацыю ўлады былі ўжо няздольныя.

Яшчэ больш паказальнай была справа яўрэйскіх купцоў Кроля і Лур'е. У 1808 г. яны выказалі жаданне завесці ў прыналежным ім у Магілёве каменным доме фабрыку на 40 станаў. У год яна павінна была даваць па 32 тыс. аршын салдацкага сукна. Арганізацыю прадпрыемства і рамонт

дома (меліся толькі сцены) яны бралі на свой рахунак. Праз 2 гады яны абяцалі даць сукно казне. У якасці льгот Кроль і Лур'е прасілі не спаганяць на працягу 12 гадоў платы за дом, а затым – плаціць за яго па 200 руб. У выпадку адбракоўкі сукна, яны таксама прасілі не падвяргаць іх штрафам і спагнанням, а бракаванае сукно – пакінуць «на іх рахунак», з правам наступнага «вольнага продажу». Паколькі гэтыя ўмовы не адпавядалі правілам, магілёўскі грамадзянскі губернатар прапанаваў ім «іншае палажэнне аб аддачы дома і аб вытворчасці ў ім сукна». Аднак купцы ад іх адмовіліся [4, т. 1, с. 311].

Тады губернатар звярнуўся да міністра ўнутраных спраў. Князь А. Б. Куракін вынес пытанне на абмеркаванне ўрада. 30 чэрвеня 1809 г. Камітэт міністраў, зыходзячы з таго, што Кроль і Лур'е мелі намер «завесці фабрыку уласным утрыманнем без дапамогі казны, і што гэта ўстанова можа паслужыць заахвочваннем і іншым заможным яўрэям да падобных жа прадпрыемстваў», вырашыў адступіць ад існуючых правілаў і дазволіў ім прадаваць «адбракаванае сукно» [4, т. 1, с. 311].

18 лютага 1810 г. купец Лур'е заключыў з казной кантракт на «будову ў Магілёве уласным коштам суконнай фабрыкі». Аднак да пачатку 1812 г. прадпрыемства так і не было створана. Калі пра гэта стала вядома міністру ўнутраных спраў, ён прасіў беларускага ваеннага губернатара герцага А. Вюртэмбергскага змусіць купца Лур'е «да абавязковага і неадкладнага выканання прынятага ім на сябе абавязка». 17 лютага 1812 г. герцаг даручыў магілёўскаму віцэ-губернатару прыняць адпаведныя меры [10, арк. 149–149 зв.]. Аднак усе намаганні аказаліся марнымі.

Як аказалася, спосабы махлярства названых асоб былі рознымі. Адны на пазыкі, не закупляючы і ўсталёўваючы абсталяванне, набывалі партыю сукна і выдавалі яго за ўласнае. Іншыя, арганізаваўшы вытворчасць, частку прадукцыі прадавалі на бок, па рынкавай цане. Трэція, усталяваўшы толькі частку з заяўленых станаў, прысвойвалі крэдыты.

**Пастаўка сукна для арміі з дзеючых прадпрыемстваў.** Не менш праблематычнай для ўрада аказалася арганізацыя паставак сукна з дзеючых фабрык. На працягу 1809–1812 гг. улады з цяжкасцю маглі знайсці пастаўшчыкоў-вытворцаў сукна практычна ва ўсіх губернях Беларусі.

Так, паводле прадпісання міністра ўнутраных спраў ад 21 мая 1810 г., грамадзянскія губернатары павінны былі выклікаць усіх фабрыкантаў і ўчыніць да 15 ліпеня падпіску на пастаўку ў 1811 г. сукна (аздобленае, валенае і суровае) і каразеі. Аднак, нягледзячы на ўсе намаганні губернатараў, большасць з трымальнікаў суконных фабрык адмовіліся ад паставак [3, с. 231].

11 ліпеня 1810 г. Міністэрства ўнутраных спраў прадпісала заключыць падрады на пастаўку сукна ў 1812 г. Аднак, як паведамляў 30 жніўня 1810 г. гродзенскі віцэ-губернатар С. Андрэеўскі, большасць фабрыкантаў

адмовілася ад пастаўкі сукна і каразеі, у т. л. гродзенскія «фабрыканты Гейзлеры». У сваю чаргу, яўрэі Іцка Лейбовіч, Берка Меерові і Гершка Янкелёвіч, якія ўтрымлівалі Ружанскую фабрыку, заявілі, што ў іх 24 ліпеня скончыўся тэрмін арэнды, і яны не жадаюць яго падаўжаць. Сам ўладальнік мястэчка і фабрыкі тайны саветнік князь Францішак Сапега, на запыт аб яго планах, заявіў, што ён не збіраецца больш вырабляць на фабрыцы сукно. Князь растлумачыў, што ён «ніякай карысці з яе не мае», а жадаючых узяць прадпрыемства ў арэнду, пры ўмове ўтрымання яго за свой кошт, няма [3, с. 237].

Адмовіўся ад вырабу і пастаўкі салдацкага сукна і ўладальнік «самай галоўнай суконнай фабрыкі» у м. Хомск Кобрынскага павета сапраўдны стацкі саветнік Войцех Пуслоўскі. Ён спаслаўся на тое, што на прадпрыемстве вырабляюцца «адны толькі тонкія сукна». Адмовіліся ад паставак сукна і невялікія прадпрыемствы ў Ваўкавыскім павеце, якія выраблялі байкі [3, с. 237].

Аб падобнай сітуацыі з пастаўкамі сукна 22 верасня 1810 г. паведамляў і мінскі грамадзянскі губернатар Г. І. фон Радзінг. Як ні спрабаваў ён схіліць уладальнікаў прадпрыемстваў, усе яго намаганні аказаліся марнымі. «Памешчыкі, якія мелі дагэтуль у маёнтках сваіх фабрыкі для вырабу сукна на хатнія адзіна патрэбы, – пісаў губернатар, – спынілі цяпер зусім на іх работы па недахопу воўны ў тутэйшым краі» [3, с. 238]. Набыць жа воўну ў іншых месцах за ўмераныя цэны не было магчымасці. У выніку, выраб сукна станавіўся стратным. Таму ўладальнікі не мелі намеру ўтрымліваць фабрыкі далей, а тым больш пастаўляць сукно ў казну па існаваўшым курсе (за 100 руб. асігнацыямі ледзь давалі 26 руб. 50 кап. срэбрам) [3, с. 238].

Адмовіліся ад паставак і найбольш даверанныя асобы мінскага губернатара, у прыватнасці, мазырскі памешчык фон Гольст. У 1809 г. Г. І. Фон Радзінгу ўдалося схіліць яго «адзіна ў выяўленні стараннасці ... да карысці казённай», да пастаўкі ў Кіеўскае камісарыяцкае дэпо 1 000 аршын суровы. Аднак страты, якія панёс фон Гольст, прымусілі яго адмовіцца ад паўтарэння падобных эксперыментаў. Таму фон Гольст, а таксама іншыя ўладальнікі суконных прадпрыемстваў – пінскі памешчык, былы падстараста Бутрымовіч, кіраўнік маёнтка тайнага саветніка І. М. Неплюева надворны саветнік Шэмбель і памешчык Рэчыцкага павета Аскерка, – заявілі аб нязручнасцях іх утрымання. А слуцкі памешчык Абуховіч, на падставе таго, што заводзіць фабрыку «для вырабу лепшага гатунку сукна з воўны з авечак ангельскай і гішпанскай пароды» (разводзіў іх ва ўласным маёнтку), паведаміў, што зусім знішчыў выраб простага сукна. Таму мінскі грамадзянскі губернатар прыйшоў да высновы пра «немагчымасць ставіць у казну з тутэйшых фабрык сукна з-за крайняга заняпаду курсу на асігнацыі» [3, с. 238].

Такім чынам, хоць спасылкі, па якіх ішла адмова ад паставак сукна, былі рознымі, галоўная прычына заключалася ў адным – нежаданні памешчыкаў,

купцоў і гандляроў беларускіх губерняў працаваць на рускую армію – верагоднага праціўніка Францыі і Княства Варшаўскага ў будучай вайне.

Да пачатку 1812 г. становішча з забеспячэннем арміі абмундзіраваннем рэзка пагоршылася. Колькасць палкоў пастаянна павялічвалася, а магчымасці расійскай суконнай прамысловасці былі абмежаваныя. Да таго ж «фабрыканты» заходніх губерняў масава адмаўляліся пастаўляць сукно для арміі. Таму ў красавіку 1812 г. міністр унутраных спраў прасіў начальнікаў губерняў «выкарыстаць усе магчымыя ... сродкі, да пераканання іх … [да] пастаўкі сукна» [10, арк. 272]. Зразумела, што гаварыць аб эканамічнай зацікаўленасці «фабрыкантаў» было па-дурному. Гэта разумеў і міністр унутраных спраў, які абяцаў за «садзейнічанне да задавальнення гэтай дзяржаўнай патрэбы» хадайнічаць аб «найвышэйшай узнагародзе іх стараннасці» [10, арк. 272].

Аднак прынятыя ўрадам меры не прывялі да істотнага паляпшэння становішча з забеспячэннем арміі абмундзіраваннем. Да лета 1812 г. сітуацыя яшчэ больш ускладнілася. Як адзначалася ў запісцы міністра ўнутраных спраў В. П. Казадаўлева «Аб недахопе ў салдацкім сукне і аб сродках да яго папаўнення», разгледжанай на пасяджэнні Камітэта міністраў 9 ліпеня 1812 г., пры агульнай патрэбе арміі ў сукне ў 3 882 056 аршын, недахоп склаў 2 124 064 аршына (54,7 %). Пры гэтым міністр нават не бачыў магчымасці кардынальным чынам, на той момант, паправіць сітуацыю [13, с. 323; 4, т. 2, с. 490–491]. Таму ўрад быў вымушаны дазволіць закупку сукна за мяжой.

*Такім чынам*, з-за адсутнасці ў беларускіх губернях прадпрыемстваў па вытворчасці ўзбраення і боепрыпасаў ўрад сканцэнтраваў асноўную ўвагу на пашырэнні ў краі суконнай вытворчасці. Мануфактуры, што ствараліся на ільготных умовах, павінны былі пастаўляць сукно для патрэб расійскага войска. Аднак прапанаваныя ўмовы для арганізацыі суконнай вытворчасці з'яўляліся эканамічна не выгаднымі для ўладальнікаў прадпрыемстваў. Да пагашэння пазыкі яны павінны былі пастаўляць сваю прадукцыю ў казну па фіксаванай цане. Ураду таксама не ўдалося істотна павялічыць пастаўку сукна з існаваўшых прадпрыемстваў. Іх уладальнікі па розных, у першую чаргу, па палітычных, матывах ухіляліся ад стварэння новых прадпрыемстваў або сабатавалі вытворчасць сукна на існаваўшых мануфактурах.

## Бібліяграфічны спіс

1. *Болбас, М. Ф.* Развитие промышленности в Белоруссии (1795–1861 гг.). Минск : Наука и техника, 1966. 268 с.

2. *Гаврилов, С. В.* Организация снабжения русской армии накануне и в ходе Отечественной войны 1812 г. и заграничных походов 1813–1815 гг. : Исторические аспекты : дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02. Санкт-Петербург, 2003. 280 с.

3. Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах : у 4 т. / Акад. навук Беларус. ССР, Ін-т гісторыі. Мінск : Выд-ва Акад. навук БССР, 1936–1954. Т. 2 : 1772–1903 гг. / пад рэд. Н. М. Нікольскага, Д. А. Дудкова, І. Ф. Лочмеля. 1940. XVI, 938 с.

4. Журналы Комитета министров. Царствование императора Александра I. 1802–1826 гг. : в 2 т. СПб. : Тип. В. Безобразова и Ко, 1888–1891. 2 т.

5. *Злотников, М. Ф.* Континентальная блокада и Россия. М.; Л.: Наука, 1966. 360 с.

6. *Исаев, Г. С.* Роль текстильной промышленности в генезисе и развитии капитализма в России, 1760–1860. Л.: Наука, 1970. 324 с.

7. М. И. Кутузов : [сб. док.] : в 5 т. / под ред. Л. Г. Бескровного. М. : Воен. изд-во, 1950–1956. Т. 3: 1808–1812. 1952. XXXI, [1], 1026 с., [6] л. ил.табл. (Материалы по истории русской армии. Русские полководцы : сб. док. / под общ. ред. В. Д. Стырова, А. В. Сухомлина).

8. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 2001 (Канцылярыя магілёўскага грамадзянскага губернатара). Воп. 1. Спр. 7. Указы Сената за 1808 г. 1.02.1808 – 15.01.1809. 256 арк.

9. НГАБ. Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 13. Указы Сената за 1810 г. 189 арк.

10. НГАБ. Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 21. Указы Сената за 1-ю палову 1812 г. 3.01.1812 – 21.06.1812. 427 арк.

11. *Николаев, И.* Суконная промышленность // Интендантский журнал. 1900. № 8. С. 11–15.

12. Полное собрание законов Российской империи. Собрание 1 : с 1649 по 12 декабря 1825 г. : в 45 т. СПб. : Тип. II отд-ния Собств. е. и. в. канцелярии, 1830–1851. 45 т.

13. Столетие Военного министерства. 1802–1902 : в 13 т. / гл. ред. Д. А. Скалон. СПб. : Тип. поставщиков двора е. и. в. т-ва М. О. Вольф, 1902–1914. Т. 5: Главное интендантское управление: исторический очерк : Ч. 1 : Ведение и царствование императора Александра I / сост. Ф. П. Шелехов. 1903. 516, II с., 6 к.

14. Lietuvos Valstybes Istorijos Archyvas. Ф. 378 (Канцылярыя Віленскага, Ковенскага і Гродзенскана генерал-губернатара). Агульны аддзел. 1809 г. Спр. 178. Па адносінах г. міністра ўнутраных спраў аб заснаванні пры Віленскім філянтрапічным таварыстве суконнай фабрыкі. 25.08.1809 – 18.11.1809. 15 арк.

УДК 352.071(476-22)(091)

# СТАНАЎЛЕННЕ СЕЛЬСКАЙ ГРАМАДЫ ЯК ІНСТЫТУТА СЯЛЯНСКАГА САМАКІРАВАННЯ Ў БЕЛАРУСІ ПАСЛЯ АДМЕНЫ ПРЫГОННАГА ПРАВА

**Г. І. Маскевіч**

*Беларускі дзяржаўны універсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, maskevich@bsu.by*

Разглядаецца працэс стварэння ніжэйшага звяна сялянскага самакіравання пасля адмены прыгоннага права – сельскай грамады, яе юрыдычнае афармленне, статус кіруючых і іншых службовых асоб (сельскі староста, сельскі і валасны пісар, дзесяцкія, соцкія, дазорцы хлебных запасных магазінаў, лясныя і палявыя вартаўнікі), фунцыяніраванне сельскага сходу. Даецца параўнаўчая характарыстыка дзейнасці органаў сялянскага самакіравання ў дзяржаўных і памешчыцкіх сялян, паказаны іх агульныя рысы і асаблівасці.